*Ю.А.Пераверзева*

# ДАБРАЧЫННАСЦЬ У БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЕ: СУЧАСНЫ СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ

Як сведчыць айчынны і замежны вопыт, дзяржаўнае фінансаванне з’яўляецца неабходным у сферы бібліятэчнай справы. Між тым у бібліятэках практыкуецца спалучэнне разнастайных крыніц і формаў фінансавання і каналаў размеркавання сродкаў. Асновай развіцця дадатковых крыніц фінансавання для бібліятэчных устаноў з’яўляюцца выкарыстанне магчымасцей дабрачынцаў і спонсараў, камерцыйных структур, пашырэнне спектра прапануемых паслуг, развіццё ўзаемадзеяння з сумежнымі сферамі дзейнасці.

Адной з крыніц атрымання дадатковых фінансавых сродкаў з’яўляецца дабрачыннасць (філантропія). Дабрачынную дзейнасць можна вызначыць як бескарыслівую дзейнасць арганізацый, якая не прыносіць ім прыбытку. Яна мае арганізаваны характар, ажыццяўляецца па плану і вызначаных праграмах. Як адзначае Р.Г.Апрэсян, яшчэ не ўстаяліся ўяўленні, не кажучы пра тэрміны, для абазначэння розных формаў дабрачыннасці. Гэта пацвярджаюць даныя амерыканскага даследчага цэнтра, у адпаведнасці з якімі ў залежнасці ад памеру дапамогі падзяляюць філантропаў па ранжырах: дабрачынец (да 5 тысяч долараў ЗША), патрон (да 1 тысячы долараў ЗША), донар (да 500 долараў ЗША), прыхільнік (да 100 долараў ЗША), памочнік (да 50 долараў ЗША) і сябар (да 30 долараў ЗША) [1]. Такая градацыя залежыць ад таго, што ў грамадстве дабрачыннасць асацыіруецца з бізнесам. Але бізнес і дабрачыннасць – паняцці процілеглыя. Бізнес арыентуецца на атрыманне прыбытку і накапленне капіталу, а дабрачыннасць не мае фінансавых і іншых абавязацельстваў з боку тых, хто атрымлівае падтрымку.

Традыцыі дабрачыннасці маюць глыбокую гісторыю. У заходняй традыцыі дабрачыннасці – дзве крыніцы: хрысціянская этыка міласэрнасці і антычная практыка патранажу. З другой паловы XIX ст. пачалі стварацца дабрачынныя фонды, якія садзейнічалі сацыяльнаму планаванню і выпрацоўцы мадэляў паляпшэння грамадскага жыцця. Заходняя дабра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чыннасць мае сваю спецыфіку, аснову якой складаюць гістарычныя традыцыі і законы. Так, у 1601 г. у Англіі быў прыняты закон, пакладзены ў аснову прававога рэгулявання дабрачыннасці. Рэгуляванне дабрачыннай дзейнасці ў сучасным выглядзе пачалося ў Англіі ў 1853 г. і працягваецца да цяперашняга часу [7].

Філантропія была спрадвеку распаўсюджана ў Расіі і Беларусі. Росквіт рускай дабрачыннасці і мецэнацтва прыпадае на другую палову XVIII – першую палову XIX ст., асабліва на час Кацярыны II і Аляксандра I. У адзначаны перыяд прадстаўнікі вядомых дваранскіх дамоў рабілі вялікія бібліятэчныя зборы, якія сталі асновай буйнейшых бібліятэк нашага часу. Гэта, у прыватнасці бібліятэка графа М.М.Румянцава, сёння Расійская дзяржаўная бібліятэка. Вядомы таксама бібліятэчныя калекцыі графа Р.Р.Арлова, графа А.С.Строганава, графа С.Г.Зорыча, князя Б.М.Юсупава.

Сваімі дабрачыннымі справамі вядомы граф К.Э.Чапскі, графіня І.М.Паскевіч, княгіня Марыя Магдалена Радзівіл. Гісторыя дабрачыннасці пачатку XX ст. не пакінула такіх гучных прозвішчаў. Найбольш у гэты перыяд вядома дзейнасць французскага вучонага-мецэната Ж.-Э.Жылбера, які падарыў Медыцынскай акадэміі ў Гродне навуковую бібліятэку, М.Валіцкага (Міцкевіча) – заснавальніка "адукацыйнага фонду" [6]. Такім чынам, можна адзначыць, што дабрачыннасцю ў Расіі і Беларусі займаліся прадстаўнікі дваранскага саслоўя.

Сённяшняя абмежаванасць распаўсюджвання філантропіі ў культуры наогул і ў бібліятэчнай справе ў прыватнасці звязана з недаацэнкай яе сацыяльнай значнасці і абумоўлена неразвітасцю рынкавых адносін, недастатковай канкурэнцыяй сярод вытворцаў, абмежаванасцю прыватных сродкаў, адсутнасцю ў гаспадарчых суб'ектаў буйных капіталаў, ільгот і прывілеяў за выдзяленне сродкаў на ажыццяўленне сацыяльна значных праектаў.

У заходнееўрапейскіх краінах быць філантропам прэстыжна і выгадна з эканамічнага пункту гледжання, таму што там шырока выкарыстоўваюцца падатковыя льготы. Іншая сітуацыя ў Расіі і Беларусі. Згодна расійскаму заканадаўству, на дабрачынныя мэты прадпрыемства можа патраціць 3%

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыбытку, якія не абкладаюцца падаткам [3]. У Беларусі грошы на дабрачыннасць можна пералічаць толькі з прыбытку, а не з асноўных фондаў прадпрыемстваў. Такія ўмовы абмяжоўваюць развіццё спонсарства і дабрачыннасці.

Традыцыйныя матывы і прычыны дабрачыннасці тлумачацца шэрагам псіхалагічных і эканамічных фактараў. На погляд Г.Л.Тульчынскага, гэта звычайны чалавечы альтруізм, жаданне палепшыць дабрабыт будучых пакаленняў, фарміраванне іміджу, рэкламы, гонар ад асабістага ўкладу ў культуру, падзяка грамадству за магчымасць дзейнічаць у яго сферы, сацыяльная адказнасць, падатковыя льготы [5]. У адрозненне ад Беларусі ў заходніх краінах і ў Расіі прававыя формы дабрачыннасці і спонсарскай дзейнасці зафіксаваны заканадаўствам. Абапіраючыся на агульныя фармуліроўкі і канцэптуальныя палажэнні закона Расійскай Федэрацыі “Аб дабрачыннай дзейнасці і дабрачынных арганізацыях”, В.К.Клюеў прапанаваў наступнае азначэнне паняцця “дабрачыннасць”: “Дабрачыннасць у бібліятэчнай справе – гэта добраахвотная дзейнасць фізічных і юрыдычных асоб па бескарыслівай (бязвыплатнай ці на льготных умовах) перадачы бібліятэцы матэрыяльных рэсурсаў (у тым ліку фінансавых), па бескарыслівым выкананні работ, прадастаўленні паслуг і аказанні іншай падтрымкі з мэтай садзей-нічання бібліятэчнаму абслугоўванню” [2, с. 52]. Бібліятэчнае абслугоўванне ўваходзіць у сістэму “Бібліятэка”, якая забяспечвае даступнасць дакументаў. У гэтым абслугоўванні выкарыстоўваюцца ўсе элементы сістэмы “Бібліятэка”, такія як матэрыяльна-тэхнічная база, персанал бібліятэкі, бібліятэчны фонд, кантынгент абанентаў. Недафінансаванне бібліятэкі адбіваецца на пагаршэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы, несвоечасовым камплектаванні бібліятэчнага фонду, адтоку кваліфікаваных бібліятэчных супрацоўнікаў. Усё гэта адлюстроўваюць асноўныя паказчыкі работы бібліятэк. Таму дабрачыннае фінансаванне павінна быць накіравана на ўсе элементы бібліятэкі як сістэмы. Яно можа быць прыцягнута як для фінансавання пэўнага напрамку бібліятэчнай работы (праекта), так і для мегапраекта (некалькіх мэтавых праектаў, аб’яднаных агульнай мэтай).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Філантрапічную дапамогу бібліятэкам могуць аказваць людзі бізнесу. Вопыт сумеснай дзейнасці бібліятэк і філантропаў сведчыць аб тым, што сярод іх ёсць прадстаўнікі розных формаў уласнасці: дзяржаўных структур і прадпрыемстваў, прыватных фірмаў, грамадскіх аб’яднанняў і дабрачынных фондаў. Такія фонды, як правіла, не імкнуцца да шырокага асвятлення сваёй дабрачыннай дзейнасці. Яны выконваюць дзве мэты: першая – паказаць прыклад іншым; другая – аб’яднаць людзей, звязаных агульнымі праблемамі і цяжкасцямі, пазнаёміць іх паміж сабой, дапамагчы ў наладжванні кантактаў з арганізацыямі, людзьмі, якія здольны ім дапамагчы. Грошы дабрачынны фонд можа атрымліваць дзякуючы асабістай прывабнасці яго заснавальніка, кіраўніка, яго выключнай прыстойнасці і вялікай колькасці раней рэалізаваных праектаў фонду. Дзейнасць дабрачынных фондаў асвятляецца ў сродках масавай інфармацыі, што прыносіць вядомасць фондам і іх заснавальнікам. Гэта прыводзіць, з аднаго боку, да павелічэння ахвяраванняў, з другога – усё больш шырокія сферы некамерцыйнай дзейнасці (уключаючы і бібліятэкі) атрымліваюць матэрыяльную і маральную падтрымку. Формы матэрыяльнай падтрымкі адрозніваюцца. Адной з іх, найбольш распаўсюджанай у цяперашні час, з’яўляецца фінансавая дапамога. Другая форма – прадастаўленне фірмамі, арганізацыямі паслуг і сваёй прадукцыі.

Перыяд актыўнага супрацоўніцтва беларускіх бібліятэк з дабрачыннымі фондамі адносіцца да сярэдзіны – канца 1990-х гг. У гэты час важкую падтрымку вядучым бібліятэкам рэспублікі аказвалі Беларускі фонд Сораса, IREX, USIA, FAO, а таксама іншыя некамерцыйныя арганізацыі, такія як ЮНЕСКА, “Жыхары Берліна дзякуюць” і інш.

Некамерцыйныя арганізацыі як філантрапічныя ўстановы ствараюцца для дасягнення сацыяльных, дабрачынных, культурных, навуковых мэт, задавальнення духоўных і іншых нематэрыяльных патрэб людзей. Існуюць наступныя арганізацыйна-прававыя формы некамерцыйных арганізацый: фонды (грамадзянскія і дабрачынныя), некамерцыйныя арганізацыі ў выглядзе некамерцыйнага партнёрства, аўтаномныя некамерцыйныя арганізацыі, аб’яднанні юры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дычных асоб (асацыяцыі і саюзы), спажывецкія кааператывы, грамадскія аб’яднанні (грамадская арганізацыя, грамадскі рух, грамадскі фонд, грамадская ўстанова).

Акрамя замежных дабрачынных устаноў, беларускія бібліятэкі знаходзяць падтрымку і з боку айчынных філантрапічных структур. Гэта фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва, фонд “Спадчына”, Беларускі фонд культуры, Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў і інш. Аднак на сёння сістэма арганізацыйнай дабрачыннай дзейнасці ў галіне бібліятэчнай справы яшчэ не сфарміравалася і не атрымала дастаткова шырокага распаўсюджвання. Развіццё дабрачыннасці напрамую залежыць ад узроўню развіцця рынкавых адносін у краіне. Дабрачынныя арганізацыі маюць патрэбу ў каардынацыі дзейнасці, узгадненні філантрапічных праграм з іншымі арганізацыямі, урадавымі структурамі і бібліятэкамі, іх дзейнасць павінна быць адкрыта для кантролю з боку грамадства. Праблемамі дабрачыннай дзейнасці можна лічыць і недастатковае вывучэнне сусветнага вопыту недзяржаўнай падтрымкі, адсутнасць адпаведнай заканадаўчай базы, недахоп фінансавых сродкаў.

Дабрачыннасць спалучае ў сабе праблемы эканамічнага, сацыяльна-этычнага, маральнага характару. Нягледзячы на гэта, “аснову агульнай ацэнкі канкрэтных дабрачынных праграм складае іх уклад у справу росквіту грамадства і павышэння дабрабыту яго грамадзян” [1, с.67]. Дабрачыннасць у галіне бібліятэчнай справы накіравана на падтрыманне агульнага культурнага ўзроўню грамадства, яго развіцця і ўдасканальвання.


1. *Апресян Р.Г.* Дилеммы благотворительности // Общественные науки и современность. – 1997. – № 6. – С. 56–67.

2. *Клюев В.К.* Фандрейзинг в условиях библиотеки // Библиография. – 2000. – № 2. – С. 51–55.

3. *Культура* на перепутье: Сб. / Под общ. ред. Б.Ю.Сорочкина. – М.: Б.и., 1994. – 247 с.

4. *Ожегов С.И.* Словарь русского языка / Под ред. Н.Ю.Шведовой. – 23-е изд., испр. – М.: Русский язык, 1991. – 911 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Тульчинский Г.Л.* Public relations: репутация, влияние, связи с прессой и общественностью, спонсорство. – СПб.: Лань, 2001. – 80 с.
6. *Частная* благотворительность на Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. // Социально-педагогическая работа.– 1997. – № 1. – С. 63–73.
7. *Черникова В.В.* Регулирование деятельности благотворительных организаций Великобритании: историко-правовые аспекты // Государство и право. – 1999. – № 8. – С. 102–104.

*А.В.Рабава*

## АРГАНІЗАЦЫЯ СУМЕСНАГА АДПАЧЫНКУ БАЦЬКОЎ І ПАДЛЕТКАЎ СРОДКАМІ ТУРЫЗМУ

Са старажытных часоў сям'я ўспрымалася як аснова матэрыяльнага і духоўнага дабрабыту чалавека, пераемнасці пакаленняў, добрага ладу жыцця, што знайшло адлюстраванне ў шматлікіх прымаўках, напрыклад, "Якое дрэва, такі клін, які бацька, такі сын", "Як бацькі жылі, так і нам наказвалі жыць" і інш.

Сацыёлагі, псіхолагі, педагогі вызначаюць шэраг цяжкасцей сацыяльна-эканамічнага, псіхолага-педагагічнага, маральнага кшталту, якія перажывае сучасная сям'я. Зніжэнне трываласці сям'і як сацыяльнага інстытута суправаджаецца ўнутранай нестабільнасцю, канфліктамі, дэзарганізацыяй сямейных адносін, скасаваннем шлюбу, узаемным адчужэннем дзяцей і бацькоў. Аўтаномія членаў сямейнай групы ўзмацняецца ўдзелам дарослых у грамадскай вытворчасці і іх заклапочанасцю яго працэсам і вынікамі. Гэта не толькі змяншае колькасць часу, які праводзіцца з сям'ёй, але больш значнымі і істотнымі робіць пазасямейныя сферы самавызначэння, такія як асабістыя поспехі ў працы, павышэнне кваліфікацыі, самасцвярджэнне ў групе калег і інш. Усё гэта, а таксама ранняя сацыялізацыя дзіцяці, знаходжанне яго ў дашкольных і школьных установах прывялі да абмежавання сям'і, дзе сталі пераважаць гаспадарча-бытавыя функцыі бацькоў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ